”

ЗАДАННІ

5 клас

для правядзення першага этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”

**(Максімальная колькасць балаў-47)**

**Заданне 1. Якія словы вымаўляюцца так:** *Максімальны бал — 5.*

| Гукі | Словы | Гукі | Словы |
|---|---|---|---|
| [ л’охка ] | | [ йал’інка ] | |
| [ б’ароска ] | | [ с’н’эх ] | |
| [ фудбол ] | | [ дз’ац’ка ] | |
| [ спарцм’эн ] | | [ с’п’авак ] | |
| [ проз’ба ] | | [ рэшчык ] | |

**Заданне 2.Адзначце нумары слоў (спалучэнняў слоў), якія напісаны правільна (без памылак).**

1.Устрыца
2.Востры
3.Збожжа
4.Эмма
5.Хутка мчаў
6.Восемь
7.Бясшумна
8.Разведчык
9.Стагоддзямі
10.Фауна
11.Паўднѐва-усходні
12.Газета “Звязда” узнагародзіла

**Заданне 3. Узнавіце фразеалагізмы, дапісаўшы іх канцавыя кампаненты.** *(Максімальны бал = 7 балаў (1 фразеалагізм = 1 бал)*

Як кот________________________ .
Куды вочы_____________________ .
Хоць касою_____________________ .
З мухамі ў____________________ .
Востры на___________________ .
Няма дзе яблыку_____________________ .
Як снег на___________________ .

**Заданне 4. Суаднясіце змест дзвюх частак табліцы:**

*Максімальны бал — 5.*

| | |
|---|---|
| **А.** Намокнуть от росы | **1.** Бляшанка |
| **Б**. Жестяная банка | **2.** Гасцяваць |
| **В.** Жидкое мучное блюдо | **3.** Абрасіцца |
| **Г.** Пребывание в гостях | **4.** Пералетаваць |
| Д. Пережить лето | **5.** Верашчака |

**АДКАЗ : А___ Б ___ В___ Г___Д___**

**Заданне 5. Зрабіце сінтаксічны разбор сказа, дайце яму характарыстыку(просты ці складаны, па мэце выказвання, па інтанацыі, развіты ці неравіты), вылучыце дзеяслоўнае і назоўнікавае словазлучэнне, зрабіце іх сінтаксічны разбор.** *(Максімальная колькасць балаў – 4: па 1 за разбор па членах і за характарыстыку, па 0,5 за выпісанае словазлучэнне, па 0,5 за разбор словазлучэння)*

***На ўзлеску злёгку пажаўцелі беластволыя бярозкі.***

1.________________________________

2.________________________________

**Заданне 6. Пабудуйце разбураны верш, пастаўце знакі прыпынку.**

*Максімальны бал — 5 ( 2 балы за правільную пабудову верша, 0,5 за кожны правільна пастаўлены знак прыпынку)*

Палюбі яе спачатку
Што яна – да ведаў крок
І засвоіш ты дзіцятка
Кніга мудрасці глыток

_____________________________________
_____________________________________
_____________________________________
_____________________________________ .

**Заданне 7. Запішыце словы па- беларуску**

*Максімальны бал — 6.*

| | |
|---|---|
| Инженер | |
| Легенда | |
| Яблоко | |
| Сердце | |
| Компьютер | |
| Жёлтый | |

**Заданне 8. Устанавіце адпаведнасць паміж сутнасцю літаратурных паняццяў і тэрмінамі, якія ім адпавядаюць. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў.**

*Максімальны бал — 5.*

| | |
|---|---|
| А. Супастаўленне двух прадметаў або дзвюх з’яў на аснове іх падабенства. | 1. Прыказкі |
| Б. У іх занатаваны мудрыя запаветы народа, багаты калектыўны вопыт паводзін у грамадстве, набытыя за стагоддзі жыццёвыя ўрокі, акрэслены маральныя законы і правілы, якім чалавеку заўсёды трэба кіравацца. | 2. Прыкметы |
| В.Трапныя народныя выслоўі, у якіх прадказваецца пэўны вынік, пацверджаны шматвяковым народным вопытам. | 3. Павер’і |
| Г. Народжаны няўменнем чалавека растлумачыць многія прыродныя з’явы, яго страхам. Заснаваны на фантазіі, выдумцы, часам на містыцы. | 4. Гумар |
| Д. Паказ жыццёвых з’яў або чалавека ў камічным, смешным выглядзе; нязлосны, добразычлівы смех. | 5. Параўнанне |

**АДКАЗ : А___ Б ___ В___ Г___Д___**

**Заданне 9. Запішыце назвы твораў, з якіх прыведзены ўрыўкі, назавіце аўтараў гэтых твораў.** *Максімальны бал = 10 балаў( па 1 за назву твора і яго аўтара)*

| **Урывак** | **Назва твора** | **Аўтар** |
|---|---|---|
| На месцы, дзе сёння шум-гоман азёр,<br>На золаку раннім крык чаек,<br>Быў некалі цёмны нязведаны бор,<br>Быў лес без канца і без краю. | | |
| Не дзіва, што тут, каля крынічкі,<br>кіпела жыццё, бо кожнаму | | |

| | | |
|---|---|---|
| хацелася стаць бліжэй да вады,<br>каб палюбавацца на сваё ўласнае<br>хараство ў яе люстры, як гэта<br>любілі рабіць прыгожыя краскі. | | |
| Чуеш, спяваюць зоры,<br>Якія дзіўныя галасы<br>У гэтым нябесным хоры! | | |
| Ніхто з дамашніх не згадае,<br>Чым рэчка Костуся займае,<br>Якая іх звязала сіла,<br>І чым яна так хлопцу міла. | | |
| Дагарэў за брамай небакрай,<br>Месяц паміж воблачкаў плыве.<br>Выйду зноў, як у мінулы май,<br>Басанож прайдуся па траве. | | |

**Даведкі**

**5 клас**

**Заданне 1. Якія словы вымаўляюцца так:** *Максімальны бал — 5.*

| Гукі | Словы | Гукі | Словы |
|---|---|---|---|
| [ л’охка ] | Лёгка | [ йал’інка ] | Ялінка |
| [ б’ароска ] | Бярозка | [ с’н’эх ] | Снег |
| [ фудбол ] | Футбол | [ дз’ац’ка ] | Дзядзька |
| [ спарцм’эн ] | Спартсмен | [ с’п’авак ] | Спявак |
| [ проз’ба ] | просьба | [ рэшчык ] | рэзчык |

**Заданне 2. Узнавіце фразеалагізмы, дапісаўшы іх канцавыя кампаненты.**
*(Максімальны бал = 7 балаў (1 фразеалагізм = 1 бал)*

Як кот *наплакаў*
Куды вочы *глядзяць*
Хоць касою *касі*
З мухамі ў *носе*
Востры на *язык*
Няма дзе яблыку *ўпасці*
Як снег на *галаву*

**Заданне 3. Суаднясіце змест дзвюх частак табліцы:**

*Максімальны бал — 5.*

| | |
|---|---|
| **А.** Намокнуть от росы | **1.** Бляшанка |
| **Б**. Жестяная банка | **2.** Гасцяваць |

| | |
|---|---|
| **В.** Жидкое мучное блюдо | **3.** Абрасіцца |
| **Г.** Пребывание в гостях | **4.** Пералетаваць |
| Д. Пережить лето | **5.** Верашчака |

**АДКАЗ : А_3__ Б _1__ В__5_ Г_2__Д__4_**

**Заданне 4. Разбярыце сказ па членах сказа, дайце яму характарыстыку, вылучыце дзеяслоўнае і назоўнікавае словазлучэнне, зрабіце іх сінтаксічны разбор.** *(Максімальная колькасць балаў – 4; па 1 за разбор па членах і за характарыстыку, па 0,5 за выпісанае словазлучэнне, па 0,5 за разбор словазлучэння)*

***На ўзлеску злёгку пажаўцелі беластволыя бярозкі***. ( апавядальны, няклічны, просты, развіты) – падкрэсліць члены сказа.

1. Пажаўцелі злёгку ( дзеяслоў, прыслоўе) , пажаўцелі на ўзлеску (дзеяслоў, назоўнік) – вызначыць галоўнае і залежнае слова.
2. Беластволыя бярозкі (прыметнік, назоўнік) – вызначыць галоўнае і залежнае слова.

**Заданне 5. Пабудуйце разбураны верш, пастаўце знакі прыпынку.**

*Максімальны бал — 5 ( 2 балы за правільную пабудову верша, 0,5 за кожны правільна пастаўлены знак прыпынку)*

Кніга – мудрасці глыток **,**
Палюбі яе спачатку **,**
І засвоіш ты **,** дзіцятка **,**
Што яна – да ведаў крок **.**

**Заданне 6. Запішыце словы па беларуску**

*Максімальны бал — 6.*

| | |
|---|---|
| Инженер | Інжынер |
| Легенда | Легенда |
| Яблоко | Яблык |
| Сердце | Сэрца |
| Компьютер | Камп'ютар |
| Жёлтый | Жоўты |

**Заданне 7. Устанавіце адпаведнасць паміж сутнасцю літаратурных паняццяў і тэрмінамі, якія ім адпавядаюць. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў.** *Максімальны бал — 5.*

| | |
|---|---|
| А. Сістэма падзей у творы, дзе развіваецца і раскрываецца характар. | 1. Прыказкі |

| | |
|---|---|
| Б. У іх занатаваны мудрыя запаветы народа, багаты калектыўны вопыт паводзін у грамадстве, набытыя за стагоддзі жыццёвыя ўрокі, акрэслены маральныя законы і правілы, якім чалавеку заўсёды трэба кіравацца. | 2. Прыкметы |
| В.Трапныя народныя выслоўі, у якіх прадказваецца пэўны вынік, пацверджаны шматвяковым народным вопытам. | 3. Павер'і |
| Г. Народжаны няўменнем чалавека растлумачыць многія прыродныя з'явы, яго страхам. Заснаваны на фантазіі, выдумцы, часам на містыцы. | 4. Гумар |
| Д. Паказ жыццёвых з'яў або чалавека ў камічным, смешным выглядзе; нязлосны, добразычлівы смех. | 5. Сюжэт |

**АДКАЗ : А__5_ Б _1__ В_2__ Г_3__Д_4__**

**Заданне 8. Запішыце назвы твораў, з якіх прыведзены ўрыўкі, назавіце аўтараў гэтых твораў.** *Максімальны бал = 10 балаў( па 1 за назву твора і яго аўтара)*

| **Урывак** | **Назва твора** | **Аўтар** |
|---|---|---|
| На месцы, дзе сёння шум-гоман азёр,<br>На золаку раннім крык чаек,<br>Быў некалі цёмны нязведаны бор,<br>Быў лес без канца і без краю. | "Ля вогнішч начлежных" | М.Танк |
| Не дзіва, што тут, каля крынічкі, кіпела жыццё, бо кожнаму хацелася стаць бліжэй да вады, каб палюбавацца на сваё ўласнае хараство ў яе люстры, як гэта любілі рабіць прыгожыя краскі. | "Крыніца" | Я.Колас |
| Чуеш, співаюць зоры,<br>Якія дзіўныя галасы<br>У гэтым нябесным хоры! | "Зоры співаюць" | А.Грачанікаў |
| Ніхто з дамашніх не згадае,<br>Чым рэчка Костуся займае,<br>Якая іх звязала сіла,<br>І чым яна так хлопцу міла. | "На рэчцы" | Я.Колас |
| Дагарэў за брамай небакрай,<br>Месяц паміж воблачкаў плыве.<br>Выйду зноў, як у мінулы май,<br>Басанож прайдуся па траве. | "Бацькаўшчына" | У.Караткевіч |